УДК 726.5.04 (476)

# Мастацка-дэкаратыўныя якасці сцен сучасных праваслаўных храмаў Беларусі

Арабей В. Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Мастацка-дэкаратыўныя якасці сцен у адрозненне ад большасці архітэктурна-мастацкіх прыёмаў абавязкова ўдзельнічаюць у фарміраванні вобраза кожнага храма і маюць першачарговае значэнне. Вылучаюцца 2 асноўныя падыходы: 1) выкарыстоўваюцца мастацка-дэкаратыўныя якасці будаўнічага матэрыялу сцен; 2) сцяна атрымлівае дэкаратыўнае пакрыццё.

Найлепшы эстэтычны ўзровень пры варыянце кладкі дасягаецца ўжываннем керамічнай абліцовачнай цэглы. Сілікатная цэгла не валодае тым каларытам і шматстайнасцю каляровых адценняў, як керамічная, у выніку чаго мае самыя горшыя мастацка-дэкаратыўныя паказчыкі, якія пажадана нейтралізаваць. Паляпшэнне эстэтычных якасцяў можа дасягацца шляхам складанага аб’ёмна-прасторавага рашэння будынка, распрацоўкай пластыкі сцен, узаемадзеяннем з керамічнай цэглай. Высокі мастацка-дэкаратыўны ўзровень маюць драўляныя храмы дзякуючы прывабнасці фактуры матэрыялу.

Абліцоўка дае дадатковыя магчымасці ў фарміраванні мастацка-дэкаратыўнага рашэння храма. Спалучэнне розных відаў драўлянай шалёўкі дазваляе ствараць унікальную фактуру плоскасці сцяны. Сучаснымі абліцовачнымі матэрыяламі, якія ўваходзяць у практыку храмабудаўніцтва, з’яўляюцца блок хаўс і сайдынг ПВХ. Першы паказвае прымальны эстэтычны ўзровень, хоць і мае празмерна правільную геаметрыю, не ўласцівую традыцыйнаму дрэву, у выніку чаго страчваецца пэўная натуральнасць матэрыялу. Другі, захоўваючы недахопы першага, вылучаецца характэрнымі для ПВХ якасцямі, як таннасць, штучнасць і часовасць, якія не суадносяцца з разуменнем храма як Дома Боскага. Эстэтычныя паказчыкі абліцоўкі з цэглы ідэнтычныя якасцям сцяны з аналагічнага матэрыялу. У асобных рэгіёнах Беларусі ў якасці аздаблення выкарыстоўваюцца розныя варыянты апрацоўкі і кладкі бутавага камення, багатыя мастацкія якасці якога актыўна выкарыстоўваліся ў мінулым.

Паводле аналізу мастацка-дэкаратыўных характарыстык сцен сучасных храмаў было выяўлена прыярытэтнае выкарыстанне ў кожным аб’екце аднаго, часам двух матэрыялаў аздаблення. Застаецца нерэалізаваным патэнцыял узаемадзеяння рознахарактарных якасцяў матэрыялаў, аналагі якога мы бачым у старадаўняй культавай архітэктуры Беларусі, які б дазволіў узбагаціць архітэктуру прыходскіх храмаў.